а
Васіл
я





Віртуальная кніжная выстава да 110-годдзя з дня нараджэння
**Васіля Віткі**

вобласці ў сялянскай сям’і. Быў старэйшым дзіцём ў сям’і, акрамя яго было яшчэ двое братоў і дзве сястры.

Скончыў Слуцкую прафтэхшколу (1928), працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, у рэдакцыях газет Бабруйска і Жлобіна (1930-1935), у газетах «**Чырвоная змена**» (1935-1937), «**Літаратура і мастацтва**» (1937-1938) і часопісе «**Полымя рэвалюцыі**» (1938-1939).

Удзельнік пахода Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Да пачатку ВАВ быў сакратаром Беластоцкага абласнога адзела Саюза пісьменнікаў БССР, з пачатку вайны працаваў у рэдакцыі газеты «**Савецкая Беларусь**», з 1942 г. – у аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ рэдактарам масавых выданняў для акупіраваных раёнаў. Супрацоўнічаў у сатырычных часопісах «**Партызанская дубінка**» і «**Раздавім фашысцкую гадзіну**».

З дня ўтварэння часопіса «**Беларусь**» (студзень 1944) працаваў яго адказным сакратаром. З 1948 – намеснік, а з 1951 – галоўны рэдактар газеты «**Літаратура і мастацтва**». У 1957-1974 – галоўны рэдактар дзіцячага часопіса «**Вясёлка**». У 1974-1987 – член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «**Беларусьфільм**».

Памёр **5 ліпеня 1996** года ў Мінску.







Спрабаваў пісаць вершы яшчэ ў 2 класе. Першыя вершы былі надрукаваны ў **1928** г. у штомесячніку «Вясна», літаратурным дадатку да бабруйскай газеты «Камуніст».

Першы зборнік вершаў «**Гартаванне**» выдадзены ў **1944** годзе ў Маскве. Затым выйшлі зборнікі паэзіі «**Поўдзень**» (1946), «**Вернасць**» (1953), «**Ружа і штык**» (1958), «**Паверка**» (1961), «**Выбраная лірыка**» (1968), «**Беларуская калыханка**» (1971), «**Праводзіны лета**» (1972), «**Вышыні святла**» (1977), «**Случчына**» (1981), «**Трэція пеўні**» (1988), зборнік сатыры і гумару «**Для дома, для альбома і трохі для эпохі**» (1983). У 1973 выйшлі «**Выбраныя творы**» ў 2 тамах.

Аўтар п’ес «**Прамень будучыні**» (1948), «**Шчасце паэта**», прысвечанай Я. Купалу (1951, пастаўлена тэатрам імя Я. Купалы ў 1952).






Паэзія Васіля Віткі вызначаецца высокім грамадзянскім пафасам. Асноўныя яе матывы:

- услаўленне подзвігу савецкага чалавека ў ВАВ;
- услаўленне гістарычных здзяйсненняў беларускага народа;
- паказ хараства роднай зямлі;
- роздумы аб жыцці і прызначэнні паэзіі.

Значнае месца ў творчасці паэта займаюць сатырычныя вершы, пародыі і эпіграмы.

Маякоўскага «**Добра!**» (1940, з Р. Лыньковым), «**Паны Галаўлёвы**» М. Салтыкова-Шчадрына (1956), кнігу В. Сухамлінскага «**Блакітныя жураўлі**» (1971), асобныя творы Л. Талстога, А. Чэхава, Я. Райніса, М. Ціханава, М. Рыльскага, М. Бажана, М. Стэльмаха, а таксама творы іншых рускіх, украінскіх, латышскіх, балгарскіх і польскіх пісьменнікаў.

На латышскую мову творы В. Віткі перакладаў Імантс Ласманіс, на украінскую Марыя Пазнанская, Юрый Назаранка и Любоў Забашта, на англійскую Уолтэр Мэй і Сяргей Сасінскі, на сербскую Вера Кусіцкі і Пётр Антановіч, на славацкую Гелена Крыжанова-Брындзова, на эстонскую Муя Вээтам, на балгарскую Найдзен Вылчаў, на чэшскую Здэнка Берграва, на французскую Сцяпан Батура, на нямецкую Уладзімір Чапега, на польскую Барыс Ошэраў і Аляксандр Барскі, на літоўскую Анзельмас Матуціс і Альбінас Жукаўскас, на нідэрландскую Р. дэ Врыес, на узбекскую Пулат Мумінаў.







Кожны беларус з маленства ведае казкі “**Вавёрчына гора**”, “**Буслінае лета**”, “**Казка пра цара Зубра**”, “**Азбука Васі Вясёлкіна**”, а многія ў дзяцінстве з нецярплівасцю чакалі чарговы нумар часопіса “**Вясёлка**”. І ўсе гэтыя выданні аб’ядноўвае імя Васіля Віткі, які прывёў новага літаратурнага героя **Васю Вясёлкіна** – усмешлівага, нібы сонцам асветленага, бялявага хлапчука ў беларускім нацыянальным адзенні, шукальніка прыгод, фантазёра , хлопчыка смелага і таварыскага. Гэты герой з’явіўся на старонках казкі “Буслінае лета”, а пазней стаў своеасаблівай эмблемай дзіцячага часопіса “Вясёлка”, першым галоўным рэдактара якога і быў пісьменнік 17 гадоў (1957 – 1974).

Аднойчы В Вітка прызнаўся: «Няма большай асалоды, як пісаць для дзяцей».












Для дзяцей В. Вітка выдаў кніжкі паэзіі і вершаваных казак «**Вавёрчына гора**» (1948), «**Буслінае лета**» (1958), «**Казка пра цара Зубра**» (1960), «**Дударык**» (1964), «**Азбука Васі Вясёлкіна**» (1965), «**Казкі**» (1968, 1976), «**Чытанка-маляванка**» (1971), «**Хто памагае сонцу**» (1975), «**Ладачкі-ладкі**» (1977), «**Мы будуем метро**» (1979), «**Мінскія балады**» (1982), «**Казкі і краскі**», «**Госці**», «**Загадка пра зярнятка**» (усе 1984), «**Дзецям**» (выбраныя творы ў дзвюх кнігах, 1986), «**Свята дружбы**» (1987), зборнік апавяданняў «**Зайчык-вадалаз**» (1962).





















В. Вітка з’яўляецца адным з аўтараў чытанак «**Роднае слова**» для 1 (1969), 2 (1970) і 3 (1988) класаў.

Пісьменнік хацеў паказаць дзецям багацце і музыку народнага слова. Гэтае жаданне было рэалізавана ў кнізе «**Чытанка-маляванка**» (1971), дзе змешчаны калыханкі, гульні-пацешкі, лічылкі, загадкі і г.д..




Апошняя кніга В. Віткі «**Дом, дзе жывуць словы**» (1995) – своеасаблівы вершаваны слоўнік. Гэта «Слоўнік народнай мовы для дзяцей», – як вызначыў жанр аўтар.




Працуючы над школьнымі падручнікамі для пачатковых класаў «Роднае слова», В. Вітка меў задуму стварыць свой падручнік, распрацаваць свае ўрокі для вучняў.  На жаль, такая кніга з’явілася ўжо пасля смерці пісьменніка, ў 2008 годзе – кніга «**Урокі роднага слова**». Гэта своеасаблівы падручнік, разлічаны на дапамогу творчаму настаўніку.






Напісаў многа літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў на маральна-этычныя і выхаваўчыя тэмы, пісаў артыкулы пра К. Чорнага, М. Лынькова, М. Танка, Я. Брыля, В. Сухамлінскага і іншых.

У 1977 выдаў кнігу дзённікаў, нарысаў і апавяданняў «**Дзеці і мы**», у 1982 — кнігу «**Урокі**», у 1988 — «**Азбука душы**». Гэтыя кнігі сталі своеасаблівай трылогіяй, у якой выкладзены палажэнні педагагічнай сістэмы, заснаванай на прынцыпе народнай педагогікі «Дабрату можа выхаваць толькі дабрата». Гэтая сістэма з улікам агульначалавечых каштоўнасцей узрасла на беларускай нацыянальнай глебе, прасякнута клопатам пра лёс беларускай мовы, літаратуры,

У **2013** годзе рэдакцыя дзіцячага часопіса «Вясёлка» сумесна з выдавецтвам «Адукацыя і выхаванне» заснавалі ўнікальную серыю кніг для дзяцей «**Бібліятэка часопіса «Вясёлка»**». Плануецца выпусціць каля 100 кніг. Заснавальнікі серыі — галоўны рэдактар часопіса Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі і дырэктар выдавецтва Мікалай Аляксандравіч Супрановіч. Аўтары твораў — класікі беларускай дзіцячай літаратуры, таленавітыя сучасныя пісьменнікі. Творы, уключаныя ў кнігі серыі, прайшлі сапраўднае выпрабаванне часам: яны былі надрукаваны ў часопісе «Вясёлка» ў розныя гады, але сустрэліся толькі на старонках кніг серыі.

У **2016** годзе ў гэтай серыі выйшаў зборнік вершаў, жартаў і апавяданняў В.Віткі «**Сонечны чараўнік**». У кнізе змешчаны вельмі пазнавальныя і прасякнутыя клопатам пра развіццё дзяцей творы пісьменніка.




Творы В.Віткі вучаць назіральнасці, любові да прыроды, сям'і і роднай зямлі. З поспехам могуць быць выкарыстаны на занятках у дашкольных установах, пачатковых класах, падчас

**Узнагароды** Васіля Віткі:

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972) за кнігі «Беларуская калыханка», «Казкі» і «Чытанка-маляванка».

У 1978 узнагароджаны дыпломам Міжнароднага журы па прэміях Х. К. Андэрсена (1978) з занясеннем прозвішча пісьменніка ў Ганаровы спіс дацкага казачніка.

Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума — «Знак Пашаны» і медалямі.

10 кастрычніка 1991 узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

**Памяць**:

У 2009 годзе рэдкалегіяй дзіцячага часопіса «Вясёлка» заснавана **Літаратурная прэмія** імя Васіля Віткі за ўклад у развіццё дзіцячай літаратуры.

Ёсць **вуліца** імя Васіля Віткі ў **Слуцку**. З мэтай увекавечання памяці пісьменіка ў красавіку 2019 года на гэтай вуліцы быў закладзены памятны **сквер**. Пазней там будзе памятны знак, арганізаваны 7 тэматычных пляцовак, якія будуць адлюстроўваць творчасць пісьменніка.

Імя Васіля Віткі носіць Акцябрская базавая **школа** і **дзіцячая бібліятэка** №6 у Мінску.